Валянцін Голубеў

доктар гістарычных навук, дацэнт,
вядучы навуковы супрацоўнік Інстытута гісторыі НАН Беларусі (г. Мінск, Беларусь)

# Інвентарныя апісанні Мінска XVIII ст. як крыніцы для гістарычнай рэканструкцыі старога горада

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ



Рэалізацыя праграмы гістарычнай рэканструкцыі старога Мінска, вывучэнне мінулага сталіцы Беларусі немагчыма без выкарыстання археалагічных і гістарычных крыніц, якія б дапамаглі вызначыць эканамічнае, сацыяльнае і культурнае прызначэнне асобных тэрытарыяльных масіваў, размяшчэнне вуліц і будынкаў у сярэдневяковым горадзе, маёмасную прыналежнасць і прызначэнне пабудоў, іх архітэктурнае аблічча, назвы вуліц і інш. Для паспяховага аднаўлення гістарычнага цэнтра Мінска, у тым ліку і поўнасцю разбуранага мінскага Замчышча, неабходна сабраць, прааналізаваць і абагульніць як мага больш інфармацыі пра ўнутранае ўладкаванне горада, яго планіроўку. Для гэтага вельмі важна максімальна поўна выкарыстаць не толькі вынікі археалагічных раскопак, але і звесткі як мага старэйшых апісанняў горада. На жаль, да апошняга часу шырокаму колу даследчыкаў і краязнаўцаў былі амаль невядомы інвентарныя апісанні г. Мінска, якія адносіліся да перыяду феадалізму, часу знаходжання горада ў складзе Вялікага Княства Літоўскага і Рэчы Паспалітай.

Аўтару за час працы ў Гістарычным архіве Літоўскай Рэспублікі ў г. Вільнюсе ўдалося выявіць чатыры дакументы, у якіх утрымліваюцца апісанні г. Мінска: Генеральны сумарыюш люстрацыі ўсіх староставаў, войтаўстваў і каралеўшчын Менскага ваяводства 1765 г. з люстрацыямі Мінскага судовага староства, Мінскага войтаўства Маляўка і рэестрам

выбару гіберны з горада Мінска [1]; Інвентар Мінскага судовага староства 1779 г. [2]; Інвентар Мінскага староства 1783 г. [3] і Тарыф дымоў Менскага ваяводства і г. Мінска 1791 г. [4]. У кожным з гэтых дакументаў ёсць пэўныя звесткі па гісторыі сталіцы Беларусі, назвах і размяшчэнні вуліц горада, месцазнаходжанні некаторых пабудоў.

Мінск фарміраваўся і развіваўся па двух баках ракі Свіслач. На правабярэжжы знаходзіліся Замак, Нізкі (Стары) Рынак, Высокі Рынак (Верхні горад), Ракаўскае (Татарскае) прадмесце. Тут размяшчаліся афіцыйныя ўстановы, большасць цэркваў і манастыроў. Амаль поўнасцю страчанае на сённяшні дзень мінскае замчышча, якое ў пазнейшых дакументах пазначалася як «Замак», «Стары замак» (раён станцыі метро «Няміга», Дома спорту таварыства «Працоўныя рэзервы» і прылеглай часткі праспекта Пераможцаў), было заснавана, па сведчанні Э. М. Загарульскага, у XI — XIII стст. [5, *21*]. Замчышча ўяўляла сабой моцнае фартыфікацыйнае збудаванне плошчаю ў 3,3 га. Аснову крэпасці складаў вал, збудаваны з дрэва і засыпаны зямлёй. Даўжыня крапаснога вала была 900 метраў, для яго пабудовы было выкарыстана каля 70 000 дрэў. І гэта без уліку дрэва, якое было ўжыта на пабудову на вале крапаснай сцяны і баявых вежаў [5, *21*]. Вал быў апаясаны глыбокім ровам, напоўненым вадой.



У часы Вялікага Княства Літоўскага ў замку размяшчалася рэзідэнцыя вялікакняжацкага намесніка, тут знаходзіліся многія ўрадавыя ўстановы, у прыватнасці гродскі (замкавы) суд. Драўляны замак часта гарэў і адбудоўваўся, пра што сведчаць запісы ў інвентарных апісаннях, гарадскіх дакументах. Вядома, што горад гарэў у 1434, 1505, 1547, 1552, 1569, 1697, 1708 , 1762 і 1776 гг. Вялікі пажар адбыўся ў 1547 г., калі замак згарэў цалкам, а горад «амаль цалкам» [6, *286—288*]. У XVIII ст. замак страціў сваё ваеннае значэнне, фактычна ён ужо быў не крэпасцю, а толькі месцам, дзе размяшчалася адміністрацыя і будынак гродскага (замкавага) суда. Падчас вялікага пажару, які адбыўся ў ноч з 6 на 7 чэрвеня 1762 г., выгарала амаль палова горада. У гэтым пажары загінулі арыгіналы пергаментных і папяровых дакументаў на разнастайныя прывілеі г. Мінска, якія былі выдадзены каралямі польскімі і вялікімі князямі літоўскімі Уладзіславам Вазам, Янам Казімірам, Міхалам Вішнявецкім, Янам Сабескім, Аўгустам III і Жыгімонтам Вазам [7, *96—97*].

Траецкае (Троіцкае) прадмесце, што размяшчалася на левым беразе ракі Свіслач, мела перыферыйнае значэнне ў горадабудаўнічай структуры Мінска XVII — XVIII стст. Гэта быў у асноўным раён, дзе практычна

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

не было адміністрацыйных ці прамысловых пабудоў. Разам з тым, некаторыя даследчыкі лічаць, што да пачатку XVII ст. менавіта тут «размяшчаўся ўласна горад (“места”) — жылы, рамесны і гандлёвы цэнтр» [6, *287*]. Сфарміраваўся гэты масіў у раёне Барысаўскага тракта, Траецкай гары і развіваўся далей у кірунку Камароўкі і Залатой горкі. Вядомы беларускі археолаг Ю. А. Заяц выказаў меркаванне, што «лакалізацыя Старога горада на левым баку Свіслачы, у раёне Траецкай гары, дае спадзяванне, што, магчыма, менавіта там могуць быць выяўлены рэшткі вакольнага горада» [8, *30*]. У старажытнасці на тэрыторыі Траецкага прадмесця размяшчаўся рынак, некалькі найбольш старадаўніх манастыроў і цэркваў. На сёння некранутай засталася толькі невялікая частка ўздоўж Свіслачы.

У сувязі з тым, што адбываецца адбудова старога Мінска, плануецца аднаўленне мінскага замчышча разам з забудовамі, якія на ім знаходзіліся, рэстаўрацыя іншых тэрыторый, для спецыялістаў можа быць карыснай любая інфармацыя са старадаўніх апісанняў горада, ад назваў вуліц і мясцовасцей да звестак пра існаванне ці месцазнаходжанне таго ці іншага будынка.



*Люстрацыя дзяржаўных уладанняў на тэрыторыі Мінскага ваяводства 1765 г.* была праведзена паводле пастановы канвакацыйнага сейма Рэчы Паспалітай 1764 г. Завяршылася яна ўвосень 1765 г.

Мэтай люстрацыі была праверка даходнасці дзяржаўных уладанняў, найперш улік колькасці падаткаплацельшчыкаў. Апошнія звычайна перапісваліся з паказаннем імя і прозвішча і фіксацыяй месца пражывання ў горадзе, мястэчку ці вёсцы. Таму такія дакументы з’яўляюцца важнай крыніцай па гісторыі населеных пунктаў Беларусі.

У змешчанай тут *люстрацыі мінскага судовага староства* ўтрымліваецца інфармацыя пра маёмасць у горадзе і пад горадам, прыбыткі з якой знаходзіліся ў распараджэнні Мінскага гродавага староства. Гэта тры юрыдыкі[1] на тэрыторыі замка, дзе знаходзіліся толькі жылыя дамы без зямельных надзелаў, юрыдычане на Татарскім канцы (6 плацаў зямлі) і юрыдыка (30 плацаў зямлі) за горадам. У горадзе было некалькі шынкоў (корчмаў) [1, *5*]. Адзначана, што замкавы будынак згарэў пры пажары (напэўна пры пажары 1762 г. — *В. Г.)* і зараз адбудоўваецца за ўласны кошт мінскага старасты. Знаходзіўся ў раёне

[1] Юрыдыка — тэрыторыя ў горадзе з магдэбургскім правам, якая належала прыватным ці царкоўным феадалам (у дадзеным выпадку Мінскаму замкаваму суду) і не падпадала пад судовую, адміністрацыйную і фіскальную ўладу гарадскога магістрата.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ


Центральный государственный исторический архив Литовской ССР

Лист использования документов

Summaryusz Wszytkich In generali Titulo Starostw Woytowstw Krolewszczyzn w Woiewodztwie Minskim sytuowanych



сучаснай плошчы 8 Сакавіка. Сярод тапаграфічных назваў горада, названых у інвентары, можна адзначыць *Татарскі канец,* які знаходзіўся ў раёне сучаснага Палаца спорту.

У інвентары Мінскага войтаўства 1765 г. [1, *62—64*] названы населеныя пункты *Маляўкі (8 дамоў), Багрымаўка (1 дом), Дворышча (5 дамоў), Шэйпічы (1 дом), Столава (2 дамы), Сакалянка (1 дом), Грэбелька (3 дамы)* — усяго 21 дом (гаспадар). Верагодна, што тут пералічаны толькі гаспадаркі, якія належалі да Мінскага дзяржаўнага войтаўства і не былі ўлічаны дамы, якія належалі прыватным уласнікам. Адзначана тут і *Серабранская карчма*, што сведчыць аб існаванні побач вёскі з такой назвай. На *Траецкай гары* знаходзілася войтаўская юрыдыка. Многія жыхары раёна «*Ляхаўка*» былі рыбакамі і плацілі падатак пад назвай «чоўнавае» за права лавіць рыбу ў Свіслачы [1, *63 адв.*].

У Генеральным сумарыюшы люстрацыі Менскага ваяводства 1765 г. змешчаны і Рэестр выбару гіберны з горада Мінска [1, *72—80*]. З яго тэксту можна даведацца пра назвы вуліц горада, размешчаных на іх

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ


Inwentarz

рэлігійных і ўрадавых установах, прыватных будынках, спецыяльных пабудовах. Тут у абавязковым парадку адзначаны і каменныя будынкі (камяніцы), якіх у той час было няшмат.

Найперш мы можам даведацца пра дакладную лічбу і маёмасць манастыроў (кляштараў), што знаходзіліся ў тагачасным Мінску. Так, у Мінскага базыльянскага Святадухавага манастыра была юрыдыка з двух плацаў у *Койданаўскім завулку*, двух плацаў на *вуліцы Зборавай;* асады ў *Ляхаўцы;* трох камяніц, што належалі яўрэям; *карчмы* пры *Маляўскай дарозе*, зямель *на Уборках і Нядзвежыне, на Кузяўцы ў Камароўцы за Пярэспай і ў Ляхаўцы*; сенажаці за *Пярэспай* і пад *Крупцам* [1, *72*].

У Мінскага кляштара бернардынаў былі 2 *камяніцы*, сенажаць *Бярозавая*, луг за *Пярэспай*, два плацы на вул. *Юраўскай* [1, *72 адв.*].



У Мінскага кляштара бернардынак — 5 плацаў на вул. *Зазыбіцкай* і яшчэ 4 — на тэрыторыі самога кляштара [1, *72 адв.*].

У Мінскага Святадухавага манастыра базыльянак — 3 плацы ў горадзе і на тэрыторыі самога кляштара [1, *72 адв.*].

У Мінскага манастыра дамініканцаў былі — 22 плацы каля самога кляштара, два плацы — на *вул. Юраўскай* і *Нямiскай*, гаспадар — за *гарадскім валам*, грунты — у *Ляхаўцы* і *Уборках*, 5 гаспадароў — у *Пярэспе*, сенажаці — *Камёнка пад Маляўкамі і ў Ляхаўцы* [1, *72 адв.*].

У ксяндзоў францысканаў быў зафіксаваны Іллічоўскі плац, дзе сядзеў *шавец* і фальварак з грунтамі ў *Ляхаўцы* [1, *72 адв. — 73*].

Маёмасць мінскіх езуітаў: 6 плацаў, прызначаных на ўтрыманне *калегіума, камяніца*; плац на *вул. Зборавай*, плац у *завулку Збораўскім; фальварак Людымонт; грунты ў Сляпянцы* [1, *73*].

Акрамя іншага ў люстрацыі адзначана наяўнасць у горадзе ўласнасці манастыроў рахітаў, дызунітаў, кармелітаў, баніфратэраў — такім чынам у горадзе налічвалася 12 манастыроў. У люстрацыі былі ўлічаны таксама дзве карчмы пана Быкоўскага, дом карчэмны *За валам*, лазня на *Траецкай гары*, Федаравічоўская цагельня на вуліцы *Юрэвіцкай*, бровар

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

на вуліцы *Нямiскай*, езуiцкi калегiум на вуліцы Зборавай [1, *73—75 адв.*].

Такім чынам, у люстрацыі 1765 г. згадваюцца 30 вуліц і 3 завулкі г. Мінска, на якіх былі дамы ці плацы, з якіх збіраўся гібернавы падатак — *вуліцы Барысаўская, Белацаркоўная, Брамавая Лошыцкая, Валоская (Валошская, Валодская), Васкрасенская, Ваўнянская, Віленская, Волкаўская, Гарошкавая альбо Глуская, Глеба і Барыса, За валам, Зазыбіцкая, Зборавая, да Лаваў ідучая, Казьмадзям'янская, Койданаўская, Каля ракі да Слабады, Лошыцкая, Макавая, Няміская (Няміжская), Пабочная Няміская, Проксіма, Рынак, Семінарская, Стары Рынак, Татарская, Татарскі канец, Траецкая гара, Францысканская, Юраўская (Юрэвіцкая), завулкі — Збораўскі, Койданаўскі, з Юравіцкай да Нямiскай вуліцы завулак.*

Назвы мясцовасцей (урочышчаў), адзначаных у люстрацыі Менскага ваяводства 1765 г.: *Камароўка, Каменная гара, Крупцы, Кузяўка, Ляхаўка, Маляўкі, Нядзвежын, Перакалт, Пярэспа, Сляпянка, Уборкі.*

*Вуліцы Мінска і забудова паводле інвентара Мінскага судовага староства 1779 г.* [2, *1*—6].

*Замак*. Забудова замка разам з усім што там было, *знішчана пажарам*. Засталося толькі два старыя склепы (будынкі) з дзвярыма, завесамі і клямкамі.

Трэці, новы склеп, пачалі будаваць *для гродскага архіва Мінскага ваяводства*, але ён на момант складання інвентара не быў закончаны.

На Замку з дазволу пана старасты быў пабудаваны «дварок» паноў Антонія і Фелікса Пятухоў, у якім захоўваліся Мінскія гродскія акты. У «дварок» вяла брама, ён меў невялікі дзядзінец. У будынку былі сені, па абодва бакі ад іх дзве ізбы з каморамі. У будынку было 10 акон, дзве печы з кафлі.


Zamek

Domy na samym Zamku Jurzdyczan

Katolicy

| Domy | |
|---|---|
| 1 | Dom JW. Michała Świdzińskiego Jenerała Sądowego |
| 2 | Dom Jana Judziewicza ... |
| 3 | Dom Hryhorego ... |
| 4 | Dom Stefana ... |
| 5 | Dom Pawła Daraszewicza |
| 6 | Dom Jana Łazarewicza |
| 7 | Dom Wawrzyńca Jurczynowicza |
| 8 | Dom Symona Kowalewskiego |
| 9 | Dom Jakuba Borowskiego |
| 10 | Dom Teodora ... |
| 11 | Dom Jana ... |
| 12 | Dom Macieja ... |
| 13 | Dom Symona ... |

Summa Domow Katolickich 13.

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ


INWENTARZ
Starostwa Minskiego Prowentow
przy Podaniu Dziesiąt-letnią Posessyą
Wielmoznemu Jmci Panu Joachimowi Korsakowi
Staroscie Emphiteutycznemu, Minskiemu, Pisa-
rzewiczowi Ziem. W.º Nowogrodzkiego Prawem
Emphiteutycznym tak na Powadze Przywileju
od Nayiasnieyszego Krola Pana Naszego
Milosciwego pod Pieczęcią mnieyszą Kancellaryi
W. X. Litt. miesiąca Kwietnia 25. Dnia, jako tez
na Mocy Instrumentu y Expozycyi od Prze-
swietney Kommissyi Skar. Rzplitey W. X.
Litt. Miesiąca Maja 2. Dnia w Roku teraz-
nieyszym 1783. wydanych, przez mnie Dwo-
rzanina Skarbowego in Fundo sporządzony,
do Listu Podawczego Dworzanskiego w Ro-
ku idącym 1783. pod Dniem 30. miesiąca
Maja wydanego, stosujący się.

Насупраць пякарня з крыжападобнай печчу. Была тут і старая стайня з двума свіронкамі для захоўвання сена.

На *Замку* знаходзілася 55 дамоў юрыдычан, якія належалі да судовага староства: 13 дамоў каталікаў (з указаннем прозвішча і імя гаспадара, сярод іх пазначаны шавец), 23 дамы яўрэяў (з указаннем прозвішча і імя гаспадара, сярод іх пазначаны кушнер, музыкант, 2 краўца, токар, бляхар). На *Падзамчышчы*, з правага боку, калі выходзіць з замку, знаходзілася яшчэ 7 дамоў яўрэяў. Усяго на замку і падзамчышчы было 30 яўрэйскіх дамоў. 8 дамоў размешчаны з правага боку, ідучы да млына.



Такім чынам, паводле інвентара Мінскага судовага староства 1779 г. можна вызначыць назвы і знаходжанне 5 вуліц, якія знаходзіліся ў цэнтры Мінска — на замчышчы, ці каля замка і на якіх знаходзіліся аб’екты, што належалі мінскаму судоваму старасце: *Падзамчышча (Падзамачак ці Падвалле), Глашчая, Татарская, Татарскі канец, Юраўская.*

*Вуліцы Мінска, паводле інвентара Мінскага староства, складзенага пры наданні пану Іяхіму Корсаку, старасце Мінскага ваяводства ад 30 мая 1783 г.* [3, *1—10*].

Вось як апісваецца *Мінскі замак*. «Ад *Старога Рынку* праз мост замкавы ўвайшоўшы, у нізінцы ёсць плац вялікі на месцы, дзе раней быў вялікі драўляны будынак, а ў ім былі з двух бакоў судовыя ізбы. Але той будынак *падчас пажару* 177… (не пазначаны год. — *В. Г.)* згарэў. Тут жа бліжэй да ўвахода ў замак на *Падваллю* каля таго былога будынка два каменныя склепы не рамантаваныя пасля звышзгаданага пажару. Пры іх трэці склепік коштам усяго Мінскага ваяводства збудаваны *для архіва гродскага* Мінскага ваяводства. Далей у замку “дварок” паноў Кубліцкіх-Пятухоў. Ад увахода ў замак з левага боку вышэйзгаданага

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ


Ulica Biało Cerkiewna
Ulica Bromowa Łoszycka
za Wałem
Ulica Łoszycka
Ulica Zborowa
Taż Ulica Zborowa



будынка-дварка былі размешчаны дамы і агароды 12 замкавых юрысдычан. Там жа, на замку, знаходзілася юрыдыка мітрапалічая: *царква ўніяцкая*, плябанія з забудаваннем і дзядзінцам абшырным і дом аднаго юрыдычаніна. На юрыдыцы старасцінскай замкавай, якая была размешчана ў самім замку, знаходзілася 13 дамоў хрысціянскіх і 28 яўрэйскіх. На *юрыдыцы Падзамкавай* насупраць *Старога Рынку* было 11 дамоў яўрэяў».

У інвентары 1783 г. названы вуліцы: *Лошыцкая пад валам*, *Юраўская*, *Падвалле*, *Пад Васкрасеннем*, *Слабада Замкавая пад горадам*, *Татарскі канец*, *Троіцкая гара*, *Стары Рынак*.

Інфармацыя, змешчаная ў інвентары Мінскага судовага староства 1783 г. дазваляе вызначыць, якія пабудовы былі на Мінскім замчышчы (у замку), якія перад гэтым згарэў, і вызначыць назвы і размяшчэнне вуліц Мінска ў раёне Замка.

У Дзяржаўным гістарычным архіве Літвы ў фондзе Скарбавай камісіі ВКЛ захоўваецца фаліянт пад назвай «Тарыф гарадскіх і сельскіх дымоў ва ўладаннях, якія размешчаны ў Мінскім ваяводстве…»

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

складзены як выніковы дакумент люстрацыі (рэвізіі) 1790—1791 гг. Люстрацыя адбылася ў адпаведнасці з пастановай ад 22 красавіка 1790 г. Чатырохгадовага сейма Рэчы Паспалітай (1788—1792 гг.). Гэта вельмі важная крыніца для гістарычнай рэканструкцыі старога горада.

У гэты зборнік быў уключаны і асобны дакумент — «Тарыф дымоў, што знаходзяцца ў горадзе яго каралеўскай міласці Мінску, складзены на аснове пастановы цяперашняга сейма, якая была прынята 22 красавіка…». Дакумент аб завяршэнні люстрацыі ў г. Мінску быў састаўлены 24 ліпеня 1790 г. і змяшчае важную інфармацыю адносна г. Мінска і яго насельніцтва ў канцы XVIII ст. Рэвізія г. Мінска была праведзена мінскімі люстратарамі, камісарамі цывільна-вайсковай камісіі ВКЛ ротмістрамі Іосіфам Немаршанскім і Міхалам Азямблоўскім.

Люстратары рабілі ўлік дымоў у г. Мінску, запісваючы іх па кожнай асобнай вуліцы, адзначаючы канфесійную прыналежнасць, прозвішча і імя гаспадара. Асобна былі ўлічаны ўрадавыя будынкі, кляштары і плябаніі (улічаныя звычайна як адзін дым), пазначаны палацы, камяніцы, дамы ўезныя і шляхецкія, двары, дамкі і дваркі шляхты (з паказаннем прозвішча, а то і займаемай пасады ўласніка). Мяшчане хрысціянскага веравызнання («хрысціяне») паводле свайго маёмаснага становішча былі выдзелены ў тры групы: тыя, хто меў зямельныя надзелы ў горадзе; тыя, хто меў толькі агароды; беззямельныя халупнікі. Жыхары г. Мінска іўдзейскага веравызнання («жыды») былі падзелены на дзве катэгорыі: на тых, хто жыў асабістымі дамамі і на халупнікаў.

Пасля апісання гарадскіх вуліц і плошчаў у «Тарыфе» зроблены пералік фальваркаў, якія знаходзіліся ў межах горада ці ў бліжэйшым прыгарадзе (з паказаннем маёмаснай прыналежнасці ўладання). Звычайна фальварак улічваўся як адзін дым. Тут улічаны таксама жыхары («мяшканцы»), якія жылі на шляхах («трактах») на ўездзе ў г. Мінск (Лошыцкім, Міхалоўскім, Ракаўскім, Тарасаўскім, Крупецкім, Віленскім, Барысаўскім). Люстратары палічылі гэтае насельніцтва ў якасці гараджан і ўнеслі ў спіс абкладання падымным, што некалькі павялічыла агульную колькасць насельніцтва г. Мінска ў канцы XVIII ст.

На аснове інфармацыі, якая змешчана ў «Тарыфе дымоў, што знаходзяцца ў горадзе яго каралеўскай міласці Мінску…», можна адзначыць асноўныя пабудовы ў г. Мінску ў 1790 г., зрабіць пералік вуліц горада, дарог, што ўваходзілі ў горад, фальваркаў, якія з'яўляліся ўласнасцю гараджан, некаторых іншых пабудоў (гл. табл. 1).



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Табліца 1*

*Вуліцы Мінска паводле люстрацыі 1790 г.* [4, *44—58 адв.*].

| № п.п. | Вуліца | Аб'екты вуліцы |
|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 |
| 1. | Высокі Рынак | Ратуша з урадавымі памяшканнямі (афіцынамі), крамамі і жылымі пакоямі (усяго 5 палацаў і 8 камяніц) (ратуша ўлічана як палац з адным дымам), «шынкавы дварок пана Пчолкі», двухпавярховая камяніца пана Макарэвіча, дзве камяніцы (двух- і трохпавярховая) пана Токбэрта, паезуіцкі кляштар, палац пана Пшэздзецкага, шынкавы дом Янкеля Мееровіча, дом пана Стэфана Златкоўскага, дом пана Вінцэнта Петрушкевіча, палац гаенскага старосты пана Валадкевіча, двухпавярховая камяніца пана Міхала Гілевіча, двухпавярховая камяніца і мураваны дварок з крамкай пана Стэфана Каліноўскага, камяніца пана Дашкофа, камяніца ксяндзоў-базыльянаў, кляштар бернардынак, дварок пані Лашакевічавай, дварок пана Мікалая Званскага, дварок пана Францішка Яроцкага, кляштар ксяндзоў-бернардынаў, кляштар базыльянак манастыра Святога Духа, кляштар ксяндзоў-базыльянаў, палац пана Ратынскага, мінскага канюшага, кляштар ксяндзоў-дамініканаў, аднапавярховая камяніца пана Івацкевіча, палац віленскага ваяводы князя Радзівіла, дварок пана Яна Пагоскага, пяць уезных дамоў. Такім чынам, на Высокім Рынку знаходзілася 33 пабудовы. Сярод іх 6 кляштараў, 5 палацаў, 8 камяніц, 5 уезных дамоў, 3 шляхецкія двары, 5 шляхецкіх прыватных дваркоў і адзін двор яўрэйскі |
| 2. | Казма-дзям'янская | 6 каменных дамоў (камяніц) шляхты: тры аднапавярховыя, 2 двухпавярховыя і адзін трохпавярховы, усяго 6 дымоў |
| 3. | Валоская | 2 палацы (пана Тышкевіча і пана Ленскага), 4 шляхецкія дамы, 3 дамы прыватныя і 2 дамы мяшчан-хрысціян (агароднікаў) |
| 4. | Белацаркоўная | 6 шляхецкіх двароў, 2 дворыкі, у мяшчан-хрысціян 1 дом з надзелам, 14 — з агародам і 4 халупы, 3 дамы жыхароў-яўрэяў |
| 5. | Брамавая Лошыцкая | 2 шляхецкія двары, 1 дворык і 6 дамоў мяшчан-хрысціян |
| 6. | Да францыс-канаў | 4 шляхецкія двары і двухпавярховая камяніца пана Прушынскага |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Працяг табл. 1*

| 1 | 2 | 3 |
|---|---|---|
| 7. | Францысканская | Кляштар францысканцаў, 5 шляхецкіх дамоў і 3 дваркі, 7 дамоў хрысціян (з іх 3 — з агародамі і 2 халупы), 9 дамоў яўрэяў (з іх 3 — халупы) |
| 8. | Зборавая | Кляштар бенедыктынак, 6 шляхецкіх дамоў і 9 шляхецкіх двароў, 13 пабудоў жыхароў-хрысціян (2 дамы з надзеламі, 6 — з агародамі, 5 халуп) і 4 дамы яўрэяў (з іх — 2 халупы) |
| 9. | Койданаўская | Кляштары манахаў рахітаў і бенедыктынаў, 9 шляхецкіх дамоў, 3 двары, 1 уезны дом Арэшкава, 5 дымоў гараджан-хрысціян (4 — з агародамі і 1 халупа), 4 дымы гараджан-яўрэяў (з іх — 2 халупы) |
| 10. | Стары Рынак | Кляштар баніфратараў, каменны будынак кагала, кагальная лазня, 2 шляхецкія дамы і 2 двары, 1 халупа гараджаніна-хрысціяніна і 8 яўрэйскіх дымоў (з іх — 3 халупы) |
| 11. | Зыбіцкая | 2 камяніцы, 2 шляхецкія дамы і 11 двароў, 36 дымоў гараджан-хрысціян (12 дамоў з надзеламі, 6 — з агародамі і 18 халуп), 10 яўрэйскіх дамоў і 10 яўрэйскіх халуп. Двары паноў Дамановіча, Ваньковіча і Чайкоўскага |
| 12. | Няміская | 3 камяніцы, 12 дамоў шляхты і 2 двары, 11 сядзіб гараджан-хрысціян (3 дамы, 3 агароды, 5 халуп), 27 яўрэйскіх дамоў, з іх — 15 халуп, дом равіна |
| 13. | Юраўская | Кляштар кармелітаў, 3 шляхецкія дамы і 2 двары, 12 дамоў мяшчан-хрысціян (8 дамоў, 3 агароды, 1 халупа), 4 — яўрэйскіх (з іх — 2 халупы) |
| 14. | Прывулак Юраўскі | 2 шляхецкія дамы і адзін двор, 15 дымоў мяшчан-хрысціян (4 дамы, 5 агародаў, 6 халуп), 2 дамы гараджан-яўрэяў і 4 халупы |
| 15. | Татарская | Плябанія ксяндза Бараноўскага, 2 дамы шляхты і 1 сядзіба, 77 сядзіб гараджан-хрысціян (33 дамы, 42 агароды, 2 халупы) і 4 сядзібы гараджан-яўрэяў, з іх 1 халупа |
| 16. | Падзамчышча каля рэзніцы | 8 сядзіб гараджан-хрысціян з агародамі, 2 дамы гараджан-яўрэяў і 32 халупы |
| 17. | На замку | Плябанія праваслаўнага мітрапаліта, 1 шляхецкі дом і 1 шляхецкая сядзіба, 26 дымоў гараджан-хрысціян (2 — з надзелам, 22 — з агародамі, 2 халупы), 8 дамоў гараджан-яўрэяў і 14 халуп |
| 18. | Траецкая гара | Кляштар траецкіх базыльянак, 14 шляхецкіх дамоў і 5 двароў, уезны дом рэферэндара Тышкевіча, 2 уезныя карчмы, 29 сядзіб гараджан-хрысціян (13 дамоў, 14 агародаў, 2 халупы), 20 сядзіб гараджан-яўрэяў і 1 халупа |



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Працяг табл. 1*

| 1 | 2 | 3 |
|---|---|---|
| 19. | Прывулак Першы каля ракі | Дом пана Яна Цыбульскага, 6 дамоў гараджан-хрысціян з агародамі, 2 дамы і 9 халуп гараджан-яўрэяў |
| 20. | Прывулак Другі | Дварок пана Базыля Дабрысевіча, дом мешчаніна Базыля Абухоўскага, 14 халуп гараджан-яўрэяў |
| 21. | Прывулак Барысаглебскі | 2 дамы і 1 халупа мяшчан-хрысціян і 10 халуп мяшчан-яўрэяў |
| 22. | Прывулак Чацвёрты | Плябанія ксяндза прасвітара траецкага, 2 дамы мяшчан-хрысціян з агародамі і 1 халупа, у гараджан-яўрэяў тут было 8 халуп |
| 23. | Прывулак Пяты | 4 халупы мяшчан-хрысціян і 3 халупы гараджан-яўрэяў |
| 24. | Прывулак Шосты | 1 дом з агародам і 4 халупы мяшчан-хрысціян, а таксама 7 халуп гараджан-яўрэяў |
| 25. | Прывулак Сёмы | 1 дом з надзелам і 2 з агародамі мяшчан-хрысціян |
| 26. | Віленская | 2 шляхецкія двары, 3 дамы з надзеламі, 17 — з агародамі і 1 халупа мяшчан-хрысціян, 4 дымы і 1 халупа гараджан-яўрэяў |
| 27. | Прывулак | 7 дамоў гараджан-хрысціян (4 — з надзелам і 3 — з агародамі) |
| 28. | Плябанская | 5 шляхецкіх дамоў і 1 двор, 23 дамы гараджан-хрысціян (2 — з надзелам, 18 — з агародам і 3 халупы), 2 дамы і 5 халуп гараджан-яўрэяў |
| 29. | Бакавая Фарная | Мінская плябанія, 3 шляхецкія двары, 27 дамоў гараджан-хрысціян (4 — з надзелам, 14 — з агародам і 9 халуп) і 6 дамоў і 1 халупа гараджан-яўрэяў |
| 30. | Прывулак, які ідзе да плябанскіх млыноў | 5 двароў шляхты, 10 дамоў гараджан-хрысціян (2 — з надзелам і 8 — з агародам) |
| 31. | Слабада Старасцінская | 20 дамоў гараджан-хрысціян (19 — з надзелам і 1 — з агародам) |
| 32. | Завалле, пачынаючы ад царквы Святога Юр’я | Двор земскага пісара Святажэцкага і дом уезны Рубіна Абрамовіча, 32 дамы гараджан-хрысціян (24 — з надзелам, 7 — з агародам і 1 халупа) і 4 дамы гараджан-яўрэяў |



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Заканчэнне табл. 1*

| 1 | 2 | 3 |
|---|---|---|
| 33. | Прадмесце Раманава | 3 уезныя карчмы (Давіда Міхеловіча, Беркі Аўсеевіча і Давіда Лейкевіча), 19 дамоў гараджан-хрысціян (10 — з надзелам, 5 — з агародам і 4 халупы) і 10 дамоў і 6 халуп гараджан-яўрэяў |
| 34. | Ляхаўка Вялікая | 13 дамоў гараджан-хрысціян (з надзелам) |
| 35. | Ляхаўка Малая | 3 дамы гараджан-хрысціян (з надзелам) |

Такім чынам, у «Тарыфе дымоў, што знаходзяцца ў горадзе яго каралеўскай міласці Мінску», складзенага 24 ліпеня 1790 г., у г. Мінску адзначана 35 вуліц, завулкаў і плацаў. У горадзе было 20 каменных будынкаў (18 належалі асобам хрысціянскага веравызнання, 2 — «камяніца кагальная» і «лазня кагальная» — яўрэйскай абшчыне г. Мінска).

Важным з пункту гледжання задачы гістарычнай рэканструкцыі старога Мінска з'яўляецца апісанне фальваркаў, якія размяшчаліся на трактах пры ўездзе ў горад: 1) «за ракой Свіслаччу ксяндзоў базыльянаў» (1 дым); 2) там жа, за р. Свіслаччу «фальварак з броварам пана Трэбарта» (1 дым); 3) «на тракце Міхалоўскім і Ракаўскім фальварак Нечвечын Шэйбінскі» (1 дым); 4) «на тракце Тарасаўскім» фальварак ксяндзоў-кармялітаў (1 дым); 5) «фальварак Макарэвіча, у ім Слабодскі жыве» (1 дым); 6) «фальварак пана Шчыгульскага» (1 дым); 7) «на тракце Крупецкім» фальварак ксяндзоў-бенедыктынаў (1 дым); 8) фальварак ксяндзоў-баніфратараў (1 дым); 9) «дом ці фальварак Людымосць пана Трэберта» (1 дым); на тракце Віленскім; 10) фальварак ксяндзоў-дызунітаў [4, *58 адв. — 59 адв.*].



У «Тарыфе…» даволі падрабязна былі апісаны дамы: *«за ракой Свіслаччу»* — 3 дамы (Ігната Масяшоўскага, Яна Камоцкага і Андрэя Аляшкевіча — мяшчане-хрысціяне); *«на тракце Лошыцкім»* — 6 дамоў (Міхала Ламацкага і Даменіка Суковіча — хрысціяне з зямельнымі надзеламі, Яна Шлічэвіча і Хаіма Янкеловіча —хрысціяне з надзеламі-агародамі, Моўшы Янкелевіча, Цолкі Рубіновіча — яўрэі з прыватнымі дамамі); *«на тракце Міхалоўскім і Ракаўскім»* — 6 дамоў (Томаша Хляпковіча, Янушэвіча, Аляксандра Эсманта, Ёзэфа Башчынскага, Макарэвіча — мяшчане-хрысціяне з зямельнымі надзеламі); *«на тракце Тарасаўскім»* — 5 дамоў (Яна Ліпіна, Цярэшкава, Яна Нецяёўскага, Пятра Эсманта і Ежы Ліпскага — мяшчане — хрысціяне з зямельнымі надзеламі); *«на тракце Крупецкім»* — 5 (дом Даменіка Навіцкага, Яна Эсманта, Сымона Воўчаноўскага, Петрушкевіча, Сымона Гарасіма-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

віча — мяшчане-хрысціяне з зямельнымі надзеламі); *«на тракце Віленскім»* — 5 дамоў (Мацея Грыбкоўскага, Мікалая Тамовіча, «дом Юлевіча на грунце Стэфана Каліноўскага», «дом Птулкоўскага на грунце таго ж Каліноўскага» — мяшчане-хрысціяне з зямельнымі надзеламі і дом Мацея Петрушкевіча, мешчаніна хрысціянскага веравызнання з агародам).

На тым жа Віленскім тракце адзначана 5 халуп мяшчан хрысціянскага веравызнання («Яна Цырынкевіча халупа на плацу тых жа (ксяндзоў дызунітаў. — *В. Г.*) пры царкве, халупа Гразыёна Чамандаўскага, халупа Базыля Фідэрмыя на плацу тых жа, халупа Ігнацыя Янцэпалы на плацу тых жа, халупа Ёгана Трыбала на плацу…»; *«на тракце Барысаўскім»* — двор Якава Аляшкевіча, дварок Андрэя Аляшкевіча.

Адзначана таксама карчма ксяндзоў базыльянаў за рэчкай Свіслаччу (1 дым); «карчма ўездная пры млынах ляхаўскіх Беркі Рубіновіча» (1 дым) (зафіксаваны як дом уездны. — *В. Г.*); на тракце Віленскім «дом Стэфана Каліноўскага карчэмны» (1 дым).

Усе гэтыя аб'екты (фальваркі, дамы, двары, дваркі, халупы, корчмы) улічаны рэвізорамі ў якасці аднаго дыма кожны. Такім чынам, на вышэйзгаданых трактах былі размешчаны 10 фальваркаў, 30 дамоў, 5 халуп, 1 двор, 1 дварок, 3 карчмы — усяго 50 дымоў, ці каля 325 жыхароў.



Складальнікі «Тарыфа» налічылі ў выніковай калькуляцыі 980 дымоў у г. Мінску. Сярод іх: «Кляштараў (манастыроў. — *В. Г.*) фундушовых чатырнаццаць, плябанія каталіцкая адна, плябаній грэкаўніяцкіх тры, палацаў сем, камяніц дваццаць адна, двароў уезных пятнаццаць, двароў шляхецкіх дзевяноста пяць, дваркоў прыватных пяцьдзясят два, дамоў грунтовых дзвесце два, дамоў агародавых дзвесце дваццаць восем, халуп хрысціянскіх восемдзесят адна, прыватных яўрэйскіх дамоў сто трынаццаць, халуп яўрэйскіх сто сорак восем. Разам усіх дымоў дзевяцьсот восемдзесят. Гэта перапіс дымоў праз нас, што ніжэй падпісаліся, складзены. Разам з прыцісненнем пячатак нашых рукамі ўласнымі падпісалі: Іосіф Немаршанскі, ротмістр і камісар цывільна-вайсковы Вялікага княства Літоўскага, мінскі люстратар; Міхал Азямблоўскі ротмістр і камісар цывільна-вайсковы Вялікага княства Літоўскага, мінскі люстратар» [4, *60 адв.*].

Такім чынам, нягледзячы на тое, што «Тарыф дымоў, што знаходзяцца ў горадзе яго каралеўскай міласці Мінску» за 1790 г. у першую чаргу падаткавы дакумент, і таму не адлюстроўвае ўсю палітру сацыяльна-эканамічнага і культурнага жыцця горада, ён з'яўляецца важнай крыніцай па гісторыі г. Мінска. У дакуменце пералічаны ўсе вуліцы,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

плошчы, тракты, уезныя дамы, корчмы, фальваркі і інш., а таксама пазначаны асноўныя грамадскія і прыватныя пабудовы, што само па сабе можа з'яўляцца гістарычным абгрунтаваннем работ па рэканструкцыі г. Мінска.

*Спіс выкарыстаных крыніц*

1. Lietuvos Vastybes Istorijos Archyvas (LVIA) — Дзяржаўны гістарычны архіў Літвы. — F. SA. Старажытныя акты. — Bib. 3789. Генеральны сумарыюш люстрацыі ўсіх староств, войтаўстваў і каралеўшчын Менскага ваяводства 1765 г.

2. LVIA. — F. 11. Скарбавая камісія ВКЛ (1509—1797 гг.). — Ap. 2. — Bib. 53. Інвентар Мінскага судовага староства, разам з замкавай юрыдыкай і слабадой у Татарскім канцы, а таксама з пералікам дамоў і гаспадароў у горадзе і за горадам, складзены пры наданні пану Даменіку Пшездзецкаму, судоваму старасце Мінскага ваяводства, 15 красавіка 1779 г.

3. LVIA. — F. 11. — Ap. 2. — Bib. 118. Інвентар Мінскага староства з апісаннем юрыдык з людзьмі, будынкамі… як у самім замку, так і за валам замкавым, а таксама ў горадзе на розных месцах і вуліцах знаходзячыхся, у тым ліку Слабады Замкавай за горадам над ракой Свіслаччу, складзенага каморнікам ВКЛ Ленезеўскім 30 мая 1783 г.

4. LVIA. — F. 11. — Ap. 1. — Bib. 709. Тарыф дымоў Менскага ваяводства 1791 г. (Раней дакумент знаходзіўся ў тым жа архіве ў складзе фонду Старажытныя акты (SA) пад сігнатурай 3372. — *В. Г.*)

5. *Загорульский, Э. М.* О местонахождении древнего Минска / Э. М. Загорульский // Мінск і мінчане : дзесяць стагоддзяў гісторыі (да 940-годдзя горада) : матэрыялы Міжнар. навук.-практ. канф. (Мінск, 7—9 верасня 2007 г.). — Мінск : Беларуская навука, 2008. — С. 17—22.

6. *Баравы, Р.* Менск / Р. Баравы // Вялікае княства Літоўскае : энцыкл. : у 2 т. / рэдкал. : Г. П. Пашкоў (гал. рэд.) [і інш.]. — Мінск, 2006. — Т. 2. — С. 285—288.

7. *Доўнар, А. Б.* Рэестр дакументаў мінскага бурмістра Яна Давіда Шэйбы / А. Б. Доўнар // Мінск і мінчане : дзесяць стагоддзяў гісторыі (да 940-годдзя горада) : матэрыялы Міжнар. навук.-практ. канф. (Мінск, 7—9 верасня 2007 г.). — Мінск : Беларуская навука, 2008. — С. 96—99.

8. *Заяц, Ю. А.* Менск на Свислочи конца XI — XIII вв. : проблема формирования поселенческой структуры / Ю. А. Заяц // Мінск і мінчане : дзесяць стагоддзяў гісторыі (да 940-годдзя горада) : матэрыялы Міжнар. навук.-практ. канф. (Мінск, 7—9 верасня 2007 г.). — Мінск : Беларуская навука, 2008. — С. 23—30.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ